*Уладзімір Зяневіч*

**ФАЛЬКЛОРНЫЯ ЎЗАЕМАЎПЛЫВЫ Ў ДАСЛЕДВАННЯХ ГЕНАДЗЯ ЦІТОВІЧА**

Навуковая дзейнасць выдатнага прадстаўніка беларускай фалькларыстыкі савецкага часу Генадзя Іванавіча Цітовіча пакінула значны след у айчыннай этнамузыкалогіі. Яго праца ў галіне практычнай фалькларыстыкі, навукова-даследчая дзейнасць зрабілі значны ўнёсак у гісторыю беларускай культуры. Актуальный тэмы беларускай музычнай фалькларыстыкі, узнятыя Цітовічам у яго этнамузыкалагічных даследаваннях, у дзейнасці ў якасці навуковага рэдактара і кансультанта, у практычнай працы мастацкага кіраўніка і аўтара аранжыровак не страцілі сваёй актуальнасці і сёння. Наадварот, пазначаныя ім кірункі навуковай і мастацкай дзейнасці, застаюцца актуальнымі для беларускай навукі і мастацтва і на сучасным этапе. Шмат якія з паднятых Цітовічам праблем здабылі ў наш час новую вастрыню і патрабуюць для іх рашэння ўважлівага вывучэння назапашанага досведу. Адной з такіх тэм, якая знітавала ўсю творчасць Г. І. Цітовіча, і навуковую, і мастацкую стала тэма фальклорных узаемасувязяў і ўзаемаўплываў культур.

Параўнальны этнамузыкалагічны аналіз народнай песеннай спадчыны ў творчасді Г. І. Цітовіча быў абумоўлены імкненнем глыбока спазнаць духоўныя здабыткі свайго народа, меў мэтай, перш за ўсё, як мага глыбей зразумець прыроду айчыннага музычнага фальклору, але таксама абапіраўся і на ўніверсальныя агульначалавечыя гуманістычныя падставы. Як піша сам Цітовіч, ён імкнуўся «...на песенным матэрыяле падкрэсліць тыя моцныя сувязі, якія злучаюць беларусаў з іх братамі-суседзямі — рускім, украінскім, літоўскім і латышскім народамі» [1, с. 18].

Грунтоўная натуральнанавуковая і гуманітарная адукацыя, (Г. І. Цітовіч вывучаў біялогію на прыродазнаўча-матэматычным факультэце Віленскага універсітэта, скончыў Віленскую кансерваторыю, паралельна з вучобай у кансерваторыі вучыўся на факультэце гуманітарных навук Віленскага ўніверсітэта (гісторыя. філалогія, этнаграфія), [3] дапытлівы розум і яркі талент дазволілі яму, па словах З. Мажэйкі, разгарнуць свой патэнцыял «тонкага мастака і дапытлівага даследніка» [4, с. 4].

Асобна трэба адзначыць два нарысы, якія ўвайшлі ў зборнік «Пра беларускі песенны фальклор»: «Украінска-беларускія сувязі ў народнай музыцы» і «Да пытання пра ўзаемасувязі беларусаў і літоўцаў у вобласці песеннага фальклору». Тут мы знаходзім вельмі перспекгыўныя для разумения прыроды музычнага фальклору разважанні аўтара пра сувязь народнай песеннай традыцыі з народнай інструментальнай і харэаграфічнай культурай. Так, каштоўнымі з'яўляюцца яго назіранні, у якіх Г. І. Цітовіч параўноўвае народны музычны інструментар блізкіх народаў, выказвае меркаванні пра ўплывы яго на фарміраванне лада і стылю народных песень, паказвае сувязь народнай інструментальнай музыкі, у тым ліку танцавальнай, з песеннымі жанрамі. На багатых прыкладах аўтар паказвае роднасць канструкцыйных асаблівасцяў народнага інструментара беларусаў і літоўцаў, аналізуе функцыянальнае, жанравае і стылявое падабенства песень гэтых народаў. У цэлым шэрагу выпадкаў, кажучы пра песні літоўцаў і беларусаў, даследчык выводзіць генэзу агульных ці падобных напеваў з найгрышаў пастухоўскіх труб. Тут чула прыкмечаная сувязь інструментальнай і песеннай культур. У іншьгм выпадку, разважаючы пра характар мелодыі і метра-рытмічныя асаблівасцях беларускай народнай песні «Там каля млына» даследчык, паказвае на сувязь гэтай песні з польскім танцам «Абэрак» і робіць выснову, што песня прыйшла на Беларусь з Полынчы. Гэтую форму запазычання аўтар вызначае тэрмінам «трагоітны распаўсюд».

У сваіх тэарэтычных працах Г.І.Цітовіч, у адпаведнасці з навуковай парадыгмай тагачаснай фалькларыстыкі, пазначыў тылы фальклорных узаемасувязяў (генетычныя і кантактныя), паказаў шматузроўневую структуру складаных і шматстайных формаў фальклорных узаемасувязяў і ўзаемаўпльгааў (узаемапранікненні, узаемаўплывы, музычна-фальклорная агульнасць, спароджаная падабенствам жыццёвых умоў народаў-суседзяў) на розных узроўнях існавання народнай традыцыі (структурным, інтанацыйна- меладычным, жанравым, тыпалагічным, гістарычным, сацыяльным, мастацка-вобразным і функцыянальным). Тым самым ён азначыў шэраг кірункаў для сучасных даследнікаў.

Г.І. Цітовіч прадбачліва завастрыў увагу на новы для таго часу падтып кантактных узаемасувязяў — медыйныя ўзаемасувязі. Сёння ў эпоху глабалізацыі гэтая тэма набыла вострую актуальнасць, бо нарастальная роля сродкаў масавай інфармацыі і пашырэнне шматлікіх формаў кантактаў, якія дэтэрмінуюць узаемаабмен і ўзаемныя ўплывы, моцна ўздзейнічаюць на культуры народаў свету і маюць не толькі пазітыўныя, але і значныя негатыўныя наступствы, ставяць пад пагрозу само існаванне традыцыйных форм народных культур.

Г.І. Цітовіч ўсталяваў і праверыў некаторыя агульныя для Беларусі меладычныя тыпы, якія раней былі зафіксаваныя толькі ў асобных рэгіёнах Беларусі і прасачыў на гэтым матэрыяле паралелі ва ўкраінскім песенным фальклоры.

Уяўляе цікавасць супастаўленне напеваў беларускіх і ўкраінскіх купальскіх і вясельных песень, якое Цітовіч робіць у артыкуле «Украінска-беларускія сувязі ў народнай музыцы». Такое параўнанне дазволіла яму ўдакладніць геаграфію распаўсюду напеваў гэтых песень на тэрыторыі Беларусі. У прыватнасці ён зняў сумневы К. Квіткі адносна наяўнасці азначаных тыпаў у Віцебскай вобласці і паўночна-заходняй частцы Цэнтральнага рэгіёна Беларусі.

Аналізуючы меладычныя асновы і рытмічную арганізацыю напеваў старажытнага гісторыка- стылявога пласта. Г. І. Цітовіч робіць здагадку пра агульныя карані старадаўніх узораў абрадавага фальклору беларусаў і ўкраінцаў. Каштоўнай уяўляецца заўвага аўтара пра вельмі рэдкія прыклады запазычанняў ў вобласці старажытных абрадавых формаў песеннага фальклору. Цітовіч адзначае, што захавальнікі фальклорнай традыцыі дбайна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захоўваюць свае напевы і рэдка робяць запазычанні старажытных песень, у той час як запазычанні пазаабрадавага фальклору позняй традыцыі з'яўляюцца вельмі распаўсюджанай практыкай. У гэтым, на думку даследчыка, праяўляюцца, у першым выпадку, сакральны характар раннетрадыцыйнага фальклору, аласцівая для народнага мыслення апазіцыя: сваё — чужое, у другім выпадку — відавочнае імкненне захавальнікаў народнай культуры да засваення навага.

Глыбокай па думцы з'яўляецца заўвага Цітовіча пра тое, што ўзаемапранікненню ўзораў песеннай народнай творчасці, якія развіваюцца «на аснове агульных каранёў музычнай мовы, спрыяла роднасная блізкасць моў» гэтых народаў [4, с. 91].

Геаграфічнае становішча, падобныя формы гаспадарання, агульнасць гістарычных лёсаў беларускага і ўкраінскага, літоўскага і польскага народаў, агульныя ідэалы і памкненні, і, абумоўленыя гэтым рысы і асаблівасці нацыянальнага характару, таксама спрыялі, па меркаванні даследніка, стварэнню гэтымі народамі блізкіх па духу і стылю песень. У гэтых выказваннях Г. І. Цітовіч выступае паслядоўнікам эстэтыкі беларускіх фальклярыстаў 20-х гадоў мінулага стагоддзя.

Каштоўнасць навуковай дзейнасці Г. І. Цітовіча для сучаснікаў складаецца ў тым, што ён у сваіх даследаваннях паклаў падмурак новай галіны беларускай навукі — параўнальнай этнамузыкалогіі, правёў велізарную параўнапьна-даследчую працу ў вобласці напеваў песень, а таксама і паэтычных тэкстаў, акрэсліў змест і ўзроўні фальклорных сувязяў і ўзаемаўплываў і, што вельмі значна і актуальна сёння, звярнуў увагу на неабходнасць разглядаць песенны фальклор ва ўсёй сукупнасці яго этнічных варыянтаў.

Тэма фальклорных узаемасувязяў і ўзаемаўплываў, пытанні, паднятыя Г. І. Цітовічам становяцца асабліва запатрабаванымі і актуальнымі ў эпоху глабалізаванага грамадства, калі ўзаемныя сувязі і паралелі, узаемаўплывы і ўзаемныя перакрыжоўванні розных этнічных культур пранікаюць на ўсе ўзроўні грамадскага і культурнага жыцця, уздзейнічаюць, дэфармуючы традыцыйныя культуры. Наступныя дзесяцігоддзі дадуць гісторыкам культуры найбагаты матэрыял, які дазволіць даследаваць і ацаніць наступствы гэтых маштабных і глыбокіх змен у структуры і змесце традыцыйных формаў нацыянальнага мастацтва. Але ўжо сёння, прасочваючы досвед айчыннай фальклярыстыкі і такіх яе яркіх прадстаўнікоў як Г. І. Цітовіч можна рабіць вызначаныя прагнозы і прымаць рэальныя крокі па згладжванні негатыўных наступстваў глабалізацыі.

**Спіс літаратуры:**


1. Анталогія беларускай народнай песні / уклад., прадм. і кам. Г. Цітовіча. - Мінск: Беларусь, 1975. -616 с.
2. Белорусская эішмузыкопогая. Очерки истории (ХК-ХХ ва)/ подред З-Я. Можейко. - Мінск: Тэхналогія, 1997. -254 с.
3. Жураўлёў, Д. Генадзь Цітовіч (Біяграфічны нарыс) / Д. Жураўлёў. - Мінск : Беларусь, 1969. - 144 с.
4. Можейко, 3JL Очерки ГИ Циговича/ЗЯ. Можейко/Ю белорусском песенном фольклоре.-Мінск: Беларусь. 1976.-С. 3.
5. Цигович,Г.И. О белорусском песенном фольклоре. Избранные очерки/ПИЦигович.-Минск: Беларусь, 1976,- 135с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ